# СМІРНОЎ ПЁТР СЯРГЕЕВІЧ



**Дата нараджэння:** 1915

**Дата смерці:** 1943

**Месца подзвігу:** г. Віцебск

**Дата подзвігу:** 1942–1943

**Ушанаванне:** г. Віцебск – мемарыяльная дошка

Адзін з кіраўнікоў Віцебскага камуністычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Камандзір Чырвонай арміі. Да службы ў арміі жыў і працаваў у Маскве. У пачатку вайны апынуўся ў акупіраваным Віцебску. Летам 1942 года арганізаваў дыверсійна-разведвальную групу, у якую ўваходзілі 15 падпольшчыкаў. Актыўнымі членамі групы былі М. П. Захарава, Я. І. Хмялёў, А. С. і І. Я. Якімавы і інш. Група П. С. Смірнова дзейнічала ў цеснай сувязі з падпольнай групай М. Я. Нагібава і армейскай разведгрупай П. А. Крылатых. Падпольшчыкі склалі план размяшчэння варожых ваенных аб'ектаў у Віцебску і яго наваколлі, які ў студзені 1943 года быў дастаўлены партызанам і перапраўлены за лінію фронту. Патрыёты распаўсюджвалі лістоўкі, вялі антыфашысцкую прапаганду, здабывалі ўзрыўчатку, зброю, удзельнічалі ў дыверсіі па знішчэнні паравоза і 2 платформ з ваеннай тэхнікай. У студзені 1943 года П. С. Смірноў, А. С. і І. Я. Якімавы і іншыя члены групы былі схоплены гітлераўцамі і пасля катаванняў расстраляны.

У 1966 годзе з мэтай ушанавання памяці П. С. Смірнова на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дулеба, Г. І.** Мемарыяльная дошка Смірнову / Г. І. Дулеба // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 69.

2. **Подлипский, А. М.** Подпольщик П. Смирнов / А. М. Подлипский, В. Рогач // Доски, берегущие память : справочник / А. М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск, 2006. – С. 13.

**Подлипский, А. М.** Подпольщик П. Смирнов / А. М. Подлипский, В. Рогач // Доски, берегущие память : справочник / А. М. Подлипский, В. Рогач. – Витебск, 2006. – С. 13.

## ПОДПОЛЬЩИК П. СМИРНОВ

Подпольная группа П. Смирнова, которая объединяла одиннадцать человек, действовала в городе с июля 1941 г. по январь 1943 г. Петр Сергеевич проходил на Витебщине действительную службу в рядах Красной Армии. Попав в окружение, он пришел в Витебск и с помощью местных патриотов приобрел документы, получил патент на открытие сапожной мастерской по улице 17-й Городокской. Этот дом был превращен в конспиративную квартиру подпольщиков, партизанских связных и армейских разведчиков. В тайниках патриоты хранили оружие, взрывчатку и антифашистскую литературу. П. Смирнов организовал разведку военных объектов врага в Витебске и его окрестностях, наносил их на план города, который затем передавал подпольному горкому партии. Группа участвовала в диверсиях на железной и шоссейной дорогах. В конце 1942 г. на железнодорожном перегоне Витебск – Княжица подпольщики пустили под откос паровоз и две платформы с военным грузом, прервав движение на десять часов, сожгли шесть цистерн с бензином и немецкий эвакопункт. В январе 1943 г. П. Смирнов и его боевые товарищи были арестованы и весной расстреляны. В 1966 г. на доме, в котором жил П. Смирнов, установлена мемориальная доска.